**Інфармацыйнае пісьмо**

УК «Абласная бібліятэка імя М. Горкага» і Інстытут гісторыі НАН Беларусі запрашаюць узяць удзел у міжнародным круглым стале «Лукаш Дзекуць-Малей (1888–1955): святар, настаўнік, перакладчык» (да 130-годдзя Л. Дзекуця-Малея і 1000-годдзя Брэста).

Круглы стол адбудзецца 25 кастрычніка 2018 г. а 13-й гадзіне ў Брэсцкай абласной бібліятэцы імя М. Горкага па адрасе: г. Брэст, б-р Касманаўтаў, 48.

Мэта круглага стала: ушанаванне памяці беларускага грамадскага і рэлігійнага дзеяча, асэнсаванне яго ўнёску ў культурна-гістарычную спадчыну Беларусі і Берасцейшчыны.

**Праблемнае поле:**

- Л. Дзекуць-Малей — асноўныя моманты біяграфіі
- Брэсцкі перыяд жыцця і дзейнасці Л. Дзекуця-Малея
- Беларускія пераклады Бібліі ў першай трэці ХХ ст.
- Л. Дзекуць-Малей і А. Луцкевіч
- Царкоўная і дабрачынная дзейнасць Л. Дзекуця-Малея ў Брэсце

Па выніках круглага стала плануецца выдаць зборнік.

Да ўдзелу ў круглым стале запрашаюцца ўсе, хто цікавіцца гісторыяй пратэстантызму ў Беларусі і гісторыяй Брэста.

**Працоўныя мовы**: беларуская, руская, польская.

**Кантакты**:

**Верамчук Ларыса Эдуардаўна**,
намеснік дырэктара па сацыякультурнай і інфармацыйнай рабоце Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага.
Тэл.: + 375 0162 43 45 25;
lora.ver66@gmail.com

**Унучак Андрэй Уладзіміравіч**,
загадчык аддзела гісторыі Беларусі Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі
Тэл.: + 375 17 284 18 39; + 375 29 335 13 73
unuchak@gmail.com